УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А. А. КУЛЯШОВА”

Аб’ект аўтарскага права

УДК 94(476.4)«13/17»:903.2(043.3)

ГАЛЫНСКІ
Раман Дзмітрыевіч

# ЭВАЛЮЦЫЯ ГАРАДСКОЙ ПРАСТОРЫ БЫХАВА І ВЫТВОРЧА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЯГО НАСЕЛЬНІЦТВА Ў XIV–XVIII СТСТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Магілёў, 2023

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”

Навуковы кіраўнік **Марзалюк Ігар Аляксандравіч**,
член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Афіцыйныя апаненты: **Цемушаў Сцяпан Мікалаевіч**,
доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;

**Кадзіра Уладзіслаў Мікалаевіч**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, першы прарэктар Інстытута сучасных ведаў імя А. М. Шырокава

Апаніруючая арганізацыя Установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

Абарона адбудзецца 30 сакавіка 2023 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.03.01 пры ўстанове адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова” па адрасе: 212022, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1, аўд. 115.

Тэлефон вучонага сакратара: 8 (0222) 60-24-80; e-mail: melnikova_as@msu.by.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”.

Аўтарэферат разасланы 22 лютага 2023 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. С. Мельнікава

# УВОДЗІНЫ

Вывучэнне сярэднявечнай урбаністыкі актуальнае па сѐнняшні дзень у айчыннай і агульнаеўрапейскай гістарычнай навуцы. Адным з найменш даследаваных беларускіх гарадоў з'яўляецца Быхаў.

***Актуальнасць даследавання*** абумоўлена адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі комплекснай працы, прысвечанай генезісу Быхава, яго тапаграфічнай структуры, планіроўцы, сацыяльна-эканамічнаму развіццю і матэрыяльный культуры гэтага горада. Больш за тое, на сѐнняшні дзень існуюць толькі адзінкавыя даследаванні, прысвечаныя эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельніцтва гарадоў на беларускіх землях (працы Ю. М. Бохана, Л. У. Калядзінскага, Д. У. Дука, І. А. Марзалюка).

Галоўныя пытанні, якія закранаюцца ў даследаванні, – эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчая дзейнасць яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст., жыццѐвая прастора і заняткі быхаўчан.

Намі вывучаецца ўрбаністычнае асяроддзе, гандлѐвыя, эканамічныя, культурныя і мілітарныя кантакты горада, яго сацыяльная тапаграфія. Уся гэта сукупнасць, у сваю чаргу, знаходзіць выразнае адлюстраванне ў комплексах рэчаў, якія з'яўляюцца люстраным адбіткам, маркерам, што вызначае жыццѐ, побыт і паводзіны чалавека. У даным выпадку – жыхара Быхава.

Вывучэнне эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці жыхароў Быхава – гэта не толькі вывучэнне рэчаў і іх класіфікацыя, як у археалогіі, а яшчэ і вызначэнне іх сацыяльнага кантэксту як элемента культуры, маркера сацыяльнага статусу.

Так, намі разгледжаны ўмовы ўзнікнення населенага пункта Быхаў, працэсы, якія ўплывалі на яго эвалюцыю, фарміраванне жыццѐвай прасторы быхаўчан і іх заняткі, а разам з імі і комплексы рэчаў, якія выкарыстоўвалі майстры і якімі карысталіся ў сваіх гаспадарках быхаўчане. Асноўная ўвага ў даследаванні накіравана на вывучэнне матэрыяльнай культуры як асноўнага крытэрыю фарміравання паўсядзѐннага жыцця быхаўчан у XIV–XVIII стст.

Вывучэнне механізмаў фарміравання матэрыяльнай культуры горада Быхава (архітэктурнае аблічча і гісторыка-тапаграфічны ландшафт) – аснова, якая дазваляе больш поўна зразумець культурныя ўзаемаадносіны паміж беларускім Падняпроўем і суседнімі рэгіѐнамі, значэнне горада ў палітычным і сацыяльным жыцці Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) і Рэчы Паспалітай (далей – РП).

Дысертацыя грунтуецца на базе наратыўных і актавых крыніц, рэпрэзентатыўных комплексаў артэфактаў, атрыманых у ходзе археалагічных даследаванняў 2012–2016 і 2018 гг., археалагічных калекцый з музейных фондаў, картаграфічных матэрыялаў. Даследаванні па падобнай тэматыцы і змесце, прысвечаныя Старому Быхаву, адсутнічаюць як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі, тым больш у рэчышчы гісторыі паўсядзѐннасці.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы са значнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыя выканана ў межах планавых навукова-даследчых работ МДУ імя А. А. Куляшова па тэмах: “Вывучэнне сістэмы рассялення ў Беларусі з часоў каменнага веку і да XVIII ст. (па даных археалогіі і пісьмовых крыніц)” (дзяржаўная праграма “Гісторыя і культура”, 2006–2010 гг., дзяржрэгістрацыя № 20065201); “Генезіс гарадскіх комплексаў Магілѐва, Быхава, Радамлі і Чэрыкава ў эпоху Сярэднявечча і Ранняга Новага часу па даных археалагічных і пісьмовых крыніц” (2011–2013 гг.); “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава” (2011–2015 гг., дзяржрэгістрацыя № 20112341); “Урбанізацыйныя працэсы на тэрыторыі магілѐўскага Падняпроўя і Пасожжа ў эпоху Сярэднявечча і Ранняга Новага часу” (2014–2015 гг., дзяржрэгістрацыя № 20142391); “Развіццѐ пасяленчых структур у беларускіх і суседніх землях у сярэднія вякі ў кантэксце прыродных і сацыяльных працэсаў” (падпраграма “Гісторыя і культура” дзяржаўнай праграмы “Эканоміка і гуманітарнае развіццѐ беларускага грамадства”, 2016–2020 гг., дзяржрэгістрацыя № 20112341); “Цэнтры ўлады і адміністрацыйнае дзяленне Магілѐўскага Падняпроўя як цывілізацыйны і сацыякультурны фактар у развіцці рэгіѐна (V – пачатак XX стагоддзяў)” (падпраграма “Гісторыя” дзяржаўнай праграмы “Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы”, 2021–2025 гг. дзяржрэгістрацыя № 20211961).

Распрацоўка тэматыкі даследавання звязана з навуковымі грантамі Міністэрства Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі грантамі: “Узбраенне магдэбургскіх гарадоў магілѐўскага Падняпроўя на прыкладзе Быхава, Шклова і Магілѐва ў XVI–XVIII стст.” (2014 г., дзяржрэгістрацыя № 20141933); «“Свае” і “чужыя”: феномен памежжа ў сярэднія вякі і Ранні Новы час ва Усходняй Еўропе як фактар фарміравання сацыя- і этнакультурнай ідэнтычнасці насельніцтва рэгіѐнаў» (2015–2017 гг., дзяржрэгістрацыя № 20151166); “Матэрыяльная культура горада Быхава ў XIV–XVIII стст.” (2018 г., дзяржрэгістрацыя № 20180451).

**Мэта і задачы даследавання**

***Мэта даследавання*** – комплексная характарыстыка эвалюцыі гарадской прасторы Быхава, вытворча-гаспадарчай дзейнасці і матэрыяльнай культуры яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. на падставе археалагічных, пісьмовых і іканаграфічных крыніц.

***Задачы даследавання:***

– крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны аналіз звестак па гісторыі Быхава XIV–XVIII стст., эвалюцыі гарадской прасторы Быхава, вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва;

– вывучэнне рамеснай вытворчасці і гандлѐвай спецыялізацыі горада; вызначэнне прычын і ўмоў, якія ўплывалі на спецыялізацыю рамеснай вытворчасці і гандлѐвай дзейнасці як элемента эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельніцтва Быхава XIV–XVIII стст.;

– сістэмная рэканструкцыя комплексаў матэрыяльнай культуры, вызначэнне іх паходжання і эвалюцыі ў часе і прасторы як адной з праяў гарадскога асяроддзя;

– вывучэнне ўзаемасувязі эвалюцыі матэрыяльнай культуры Быхава, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага статусу горада ў кантэксце вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельнікаў.

У якасці ***аб'екта даследавання*** выступаюць: гарадская прастора (горадаўтваральныя працэсы, забудова і планіроўка горада), вытворча-гаспадарчая дзейнасць насельніцтва Быхава (праца, заняткі, побыт) і матэрыяльная культура.

***Прадмет даследавання*** – аналіз пісьмовых (летапісы і хронікі, заканадаўчая і судовая дакументацыя, прыватная перапіска) і іканаграфічных крыніц (малюнкі, карты і планы горада, фотадакументы). Вывучэнне паходжання і развіцця артэфактаў, атрыманых у ходзе раскопак (прылады працы, прадметы ўзбраення, побытавыя рэчы, жыллѐ і г. д.).

***Храналагічныя межы даследавання*** – XIV – канец XVIII ст. Ніжняя храналагічная мяжа – першая летапісная згадка Быхава ў "Спісе рускіх гарадоў бліжніх і дальніх". Верхняя мяжа – пераход горада пад уладу Расійскай Імперыі ў 1772 г. і апошнія спробы паўнавартаснай перабудовы горада пасля яго далучэння да гэтай дзяржавы.

***Геаграфічныя межы*** закранаюць эвалюцыю гарадской прасторы Быхава, яго матэрыяльную культуру і развіццѐ вытворча-гаспадарчай дзейнасці жыхароў. Шэраг крыніц тычыцца горада Магілѐва, мястэчак Баркалабава і Новы Быхаў. Іншыя геаграфічныя рэгіѐны прыведзены ў даследаванні выключна ў якасці прыкладу ці дэманстрацыі гандлѐвых і палітычных стасункаў з іншымі ўрбаністычнымі цэнтрамі.

***Метады даследавання:*** апісальны, параўнальны, праблемна-храналагічны, параўнальна-гістарычны, сістэмны, гісторыка-сістэмны, аналітычны, картаграфічны, стратыграфічны, тыпалагічны; рэканструкцыі, мадэлявання і аналогіі.

**Навуковая навізна даследавання:**

1) упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі зроблены комплексны аналіз эвалюцыі гарадской прасторы Быхава разам з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст., узаемасувязі з імі матэрыяльнай культуры сярэднявечнага горада пры выкарыстанні максімальна поўнага комплексу крыніц; 2) на падставе вывучэння эвалюцыі матэрыяльнай культуры горада прааналізавана развіццё вытворча-гаспадарчага існавання жыхароў Быхава з часоў першай згадкі паселішча ў пісьмовых крыніцах да пераўтварэння ў сталіцу графства; 3) разгледжаны ўплыў прыродна-кліматычных, сацыяльных, знешнепалітычных змен на фарміраванне гарадскога паселішча ў Верхнім Падняпроўі і вызначэнне іх ролі ў фарміраванні гарадской прасторы Быхава, вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст.; 4) вызначана рамесная спецыялізацыя Быхава як аснова фарміравання вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст.; 5) высветлены прычыны і ўмовы эвалюцыі Быхава ў горад-крэпасць, ахарактарызавана яго сацыяльна-эканамічная і палітычная роля ў рэгіёне.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

**1.** Гістарыяграфія г. Быхава па ўказанай праблеме падзяляецца на тры храналагічныя перыяды, якія адрозніваюцца колькасцю і якасцю навуковых метадаў даследавання. Першыя публікацыі, якія пабачылі свет да сярэдзіны XX ст., насілі кампілятыўны і фрагментарны характар. Першыя даследаванні агульнагістарычнага характару і першыя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі горада Быхава праводзяцца з 1960-х гг. Паўнавартаснае гістарычнае і археалагічнае вывучэнне тэрыторыі горада пачалося толькі ў канцы XX ст. Паўнавартаснае комплекснае вывучэнне крыніц па гісторыі горада Быхава і яго насельніцтва ў гістарыяграфіі адсутнічае.

**2.** У эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. вылучаюцца наступныя этапы:

– сельскае паселішча з феадальным дваром – XIV ст.;

– умацаваная сядзіба-замак – канец XIV–XV стст.;

– паселішча з некалькімі ўмацаванымі сядзібамі-замкамі (да трох) – пачатак XVI ст.;

– прыватнаўласніцкі горад з паўнавартасным замкам, які адначасова з'яўляўся цэнтрам латыфундыі і Быхаўскага графства з драўляна-земляным замкам, – сярэдзіна – канец XVI ст.;

– перапланіроўка гарадской забудовы і ўзвядзенне мураванага замка з гарадской бастыѐннай фартыфікацыйнай сістэмай – канец XVI ст. – 1630-я гг. Горад атрымлівае выразны падзел на кварталы з сакральнымі архітэктурнымі дамінантамі кожнай з наяўных канфесій, якія маркіруюць этнаканфесійную і сацыяльную структуры гарадской супольнасці;

– рэзкае скарачэнне гарадскога насельніцтва і заняпад сядзібных комплексаў у пачатку XVIII ст. і іх паступовае адраджэнне к сярэдзіне стагоддзя. Узнаўленне і рэканструкцыя пашкоджаных пасля Паўночнай вайны гарадскіх фартыфікацыйных збудаванняў – сярэдзіна XVIII ст.

**3.** Горад і замак змянялі прасторавую лакацыю два разы, што карэнным чынам паўплывала на гарадскую структуру Быхава і спрыяла зменам у побытавай і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго жыхароў.

**4.** Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. была абумоўлена наступнымі фактарамі: геаграфічнымі, прыродна-кліматычнымі, знешнепалітычнымі, сацыяльна-палітычнымі, агульнаеўрапейскімі ўрбаністычнымі тэндэнцыямі эпохі Рэнесансу і барока.

**5.** Асноўныя функцыі Быхава ў часы Хадкевічаў і Сапегаў – рэпрэзентатыўная, абарончая і эканамічная. Быхаў быў цэнтрам адной з найбуйнейшых латыфундый, размешчаных на ўсходнім памежжы РП, якая адначасова з'яўлялася асноўным збройніцкім цэнтрам у рэгіѐне. З XVII да канца XVIII стст. Быхаў адыгрываў ролю асноўнага мілітарнага цэнтра на Падняпроўі з-за першакласных умацаванняў і наяўнасці збраѐвых майстэрняў. Істотную крыніцу прыбыткаў горада складаў экспарт зброі і вайсковага рыштунку.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойнай і завершанай працай аўтара. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплексна даследаваны ўвесь спектр крыніц па гісторыі матэрыяльнай культуры беларускага сярэднявечнага горада як маркера эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. Распрацавана аўтарская тыпалогія пэўных археалагічных комплексаў, на падставе якой прасочана эвалюцыя паўсядзѐннага існавання быхаўчан у XIV–XVIII стст. У навуковы ўжытак уведзены шэраг новых крыніц (археалагічныя калекцыі, фотадакументы, інвентары горада Быхава), якія раней ці не вывучаліся ўвогуле, ці не атрымалі пільнага навуковага даследавання ў кантэксце вывучэння жыцця быхаўчан і матэрыяльнай культуры горада. Створаны каталог археалагічнага матэрыялу і выканана рэканструкцыя

знешняга выгляду комплексаў побытавых рэчаў, архітэктурных аб'ектаў і гарадской забудовы.

**Апрабацыя дысертацыі і вынікаў даследавання**

Вынікі работы прайшлі апрабацыю на 25 навуковых рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях: “Раманаўскія чытанні” (Магілёў, МДУ імя А. А. Куляшова, 2015 г., 2016 г., 2018 г.), “Маладая навука” (Магілёў, МДУ імя А. А. Куляшова, 2016 г., 2017 г., 2018 г.), “Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць” (Магілёў, 2015 г., 2017 г., 2019 г.), “Быхаўскія краязнаўчыя чытанні” (Магілёў, 2015 г., 2016 г., 2017 г., 2018 г., 2019 г., 2020 г., 2021 г.), “Рэлігія і грамадства” (Магілёў, 2016 г., 2018 г.), “Post mortem. Погребальные памятники в историко-культурном пространстве: проблемы изучения и сохранения” (Мінск, НАН Беларусі, 2016 г.), “Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі” (Мінск, НАН Беларусі, 2014 г., 2015 г., 2016 г., 2017 г.), “Pax militaris: людзі, узбраенне, фартыфікацыя (ад старажытнасці і да пачатку XIX ст.)” (Мінск, НАН Беларусі, 2017 г.), “Капыцінскія чытанні” (Магілёў, МДУ імя А. А. Куляшова, 2022 г.).

На падставе даследаванняў аўтара распрацаваны новыя і ўдакладнены існуючыя гісторыка-краязнаўчыя, гісторыка-археалагічныя і мілітарныя экскурсіі УК “Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей” (акт укаранення ад 5 верасня 2016 г., два акты ўкаранення ад 6 верасня 2017 г., акт укаранення ад 6 чэрвеня 2022 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыйнага даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прадстаўлены ў 30 навуковых публікацыях. З іх – 8 артыкулаў у навуковых рэцэнзуемых часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (5,21 аўт. арк.), 19 – артыкулы ў зборніках навуковых канферэнцый (4,7 аўт. арк.), 2 – у матэрыялах канферэнцый (0,07 аўт. арк.). Апублікавана 1 калектыўная манаграфія, у якой адна з глаў у сааўтарстве (0,17 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 10,15 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыйнага даследавання**

Дысертацыя складаецца з двух тамоў. Том 1 утрымлівае тэкставую частку: уводзіны, агульную характарыстыку работы, тры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс з 400 пазіцый, з якіх 30 – уласныя публікацыі аўтара. Тэкставая частка складае 112 старонак, бібліяграфічны спіс – 33 старонкі (усяго ў першым томе – 145 старонак). Другі том складаецца з дадаткаў 1–15 на 186 старонках. Агульны аб'ём даследавання – 331 старонка.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, вызначаюцца мэта, задачы, вылучаюцца аб’ект і прадмет даследавання.

У **главе 1 “Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання”** вызначаецца ступень даследаванасці вывучаемай тэмы ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, аналізуюцца крыніцы, на якіх грунтуецца даследаванне, прыводзіцца іх класіфікацыя, прааналізавана развіццѐ матэрыяльнай культуры Быхава.

**Раздзел 1.1 “Гістарыяграфія”** утрымлівае **падраздзел 1.1.1 “Даследаванні агульнагістарычнага характару”**. Першапачатковы этап даследаванняў – XIX – сярэдзіна XX ст. Работы з’яўляліся вельмі фрагментарнымі і насілі ў асноўным кампілятыўны характар.

**Падраздзел 1.1.2 “Даследаванні па эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельніцтва гарадоў”** дэманструе вывучэнне пытання эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці ў сярэднявечных гарадах у гісторыі Еўропы і Беларусі.

**Падраздзел 1.1.3 “Даследаванні гістарычна-тэматычнага характару”** закранае гістарычныя, краязнаўчыя і першыя археалагічныя даследаванні непасрэдна горада Быхава. Напрыканцы 50-х – 60-х гг. XX ст. з’яўляюцца грунтоўныя працы па беларускай урбаністыцы, звязаныя з даследаваннямі З. Ю. Капыскага, А. П. Грыцкевіча, А. М. Мальцава, Л. С. Абэцэдарскага.

**Падраздзел 1.1.4 “Даследаванні археалагічнага характару”** расказвае пра археалагічныя вышукі пачынаючы з канца XIX ст. Тады працавалі даследчыкі: Ф. Я. Нарбут, Н. М. Турбін, Е. Р. Раманаў, С. С. Шутаў. Першыя паўнавартасныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі горада праводзіліся Л. Д. Побалем, Я. Р. Рыерам, В. Ф. Капыціным, І. І. Сінчуком, І. А. Марзалюком і Р. Д. Галынскім.

**Падраздзел 1.1.5 “Краязнаўчыя даследаванні”** аналізуе зборнікі матэрыялаў канферэнцый і газетных артыкулаў, публікацыі ў зборніках артыкулаў краязнаўчых канферэнцый.

**Раздзел 1.2 “Крыніцы”** прысвечаны аналізу крыніц па гісторыі горада Быхава: дакументальныя, апавядальныя, выяўленчыя і археалагічныя матэрыялы.

**Падраздзел 1.2.1 “Пісьмовыя крыніцы”** складаецца з апісання наратыўных і актавых дакументаў. *Наратыўныя дакументы* – летапісныя і хранікальныя дакументы са згадкамі Быхава: “Спіс гарадоў рускіх дальніх і

бліжніх”, “Баркулабаўскі летапіс”, “Магілёўская хроніка Трафіма Сурты і Трубніцкіх” і інш. *Актавыя дакументы* – маёмасныя інвентары, юрыдычныя і вайсковыя лісты.

**Падраздзел 1.2.2 “Выяўленчыя крыніцы”** дае характарыстыку выяўленчых крыніц, якія складаюцца з мастацка-выяўленчых, выяўленча-картаграфічных і выяўленча-натуральных. *Мастацка-выяўленчыя* крыніцы дазваляюць даведацца пра знешні выгляд архітэктурных аб’ектаў, адзенне, узбраенне, транспартныя сродкі, заняткі і іншыя аспекты гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго жыхароў. Выкарыстанне *выяўленча-картаграфічных крыніц* дае інфармацыю пра змены ў планіроўцы горада. Крыніцы *выяўленча-натуральныя* – фотаздымкі (фіксуюць выгляд і стан захаванасці забудовы горада ў ХХ ст.).

**Падраздзел 1.2.3 “Помнікі археалогіі. Комплексы рэчаў”** прысвечаны археалагічным крыніцам, артэфактам з тэрыторыі горада Быхава. Гэта агляд асноўнага корпуса крыніц па вывучэнні матэрыяльнай культуры горада.

**Падраздзел 1.2.4 “Метады даследавання”** закранае асноўныя метады і прынцыпы гістарычнага і археалагічнага пазнання, выкарыстаныя аўтарам у дысертацыйным даследаванні.

**Глава 2 “Тапаграфія і планіграфія Быхава”** цалкам прысвечана вывучэнню ўзнікнення і развіцця Быхава як населенага пункта.

**Раздзел 2.1 “Прыродна-кліматычныя, агульнагістарычныя і этнічна-рэлігійныя ўмовы развіцця горада”** разглядае ўмовы ўзнікнення і эвалюцыю Быхава на ўсіх стадыях яго існавання на працягу XIV–XVIII стст. Аналізуюцца геаграфічныя, прыродна-кліматычныя, агульнагістарычныя, сацыяльна-эканамічныя і знешнепалітычныя ўмовы.

Геаграфічныя і прыродна-кліматычныя ўмовы – размяшчэнне Быхава на рацэ Днепр, пахаладанне і “вяртанне” у XIV ст. сельскага несельніцтва з водападзелаў у поймы рэк. Знешнепалітычны фактар – татарская навала, уключэнне Падняпроўя ў склад ВКЛ і войны з Маскоўскай дзяржавай. Стракатасць этнічна-канфесійнай структуры насельніцтва горада нанесла адбітак на матэрыяльную культуру яго носьбітаў. Стары Быхаў развіваўся ў кантэксце агульнаеўрапейскіх тэндэнцый Рэнесансу і барока. Апошняя акалічнасць прывяла да яго пераўтварэння ў ідэальны горад-крэпасць у канцы XVI–XVII стст.

У **падраздзеле 2.2.1 “Быхаў у XIV – пачатку XVI стст.” раздзела 2.2 “Эвалюцыя горада і яго забудовы”** разгледжана пытанне ўзнікнення і развіцця Быхава на першапачатковым этапе існавання паселішча.

**Падраздзел 2.2.2 “Замак”** прысвечаны аналізу фактараў, якія ўплывалі на змены і асноўныя працэсы перабудовы замка. Тут апісваецца знешні выгляд

замка і палацава-замкавага комплексу. Замак эвалюцыянаваў з “двара” – сядзібы феадала (XIV ст.) – да драўляна-землянога замка к сярэдзіне XVI ст., перажыў адзін перанос. У пачатку XVII ст. быў перабудаваны ў каменны замак. К сярэдзіне XVII ст. эвалюцыянаваў у палацава-замкавы ансамбль.

**Падраздзел 2.2.3 “Горад”** дэманструе развіццё горада ў межах абарончых умацаванняў. Прыведзены асноўныя сегменты і дамінанты гарадской забудовы, сацыяльна-эканамічнае размеркаванне насельніцтва ў гарадской забудове, знешні выгляд і эвалюцыя архітэктурных дамінант. Вакол “двара”, а потым замка, з цягам часу разрастаўся горад, які ператвараўся ў места.

У **раздзеле 2.3 “Пасады”** аналізуецца забудова Быхава за межамі гарадскіх умацаванняў. Вывучана ўзнікненне, эвалюцыя, прасторавая і храналагічная лакалізацыя пасадаў. Пасады насяляліся быхаўчанамі згодна з іх этнічна-рэлігійнай, сацыяльна-эканамічнай прыналежнасцю і прафесійнай дзейнасцю.

**Раздзел 2.4 “Абарончыя ўмацаванні”** прысвечаны аналізу гарадскіх умацаванняў, іх эвалюцыі на розных стадыях існавання. Першапачаткова горад меў толькі вал (магчыма, два) і сухі роў. З XVII ст. – роў з вадой і развітую складаную бастыённую сістэму. У XVIII ст. абарончыя ўмацаванні перацярпелі значныя змены ў бок спрашчэння.

**У раздзеле 2.5 “Некропалі Быхава”** дэманструецца сацыяльна-рэлігійны аспект жыцця насельніцтва Быхава праз пахавальную традыцыю мяшчан. У сярэднявечным Быхаве на працягу XVI–XIX стст. было не менш за тры некропалі (Белагорацкія і Сабілаўскія могілкі, могілкі на Паўднёвым гарадзішчы) і не менш за тры цвінтары.

**Раздзел 2.6 “Стратыграфія культурнага слоя горада”** апісвае эвалюцыю Быхава ў прасторы і часе на падставе археалагічных даных. Прыводзіцца лакалізацыя разнастайных пабудоў, робіцца верыфікацыя картаграфічных крыніц. Самыя старажытныя культурныя напластаванні горада датуюцца не раней за XI ст. Дакладныя звесткі пра забудову і планіроўку горада адносяцца да канца XVI–XVIII стст. Агульная археалагічна даследаваная плошча горада Быхава складае 1 674,43 м$^2$, у гістарычных частках горада культурны слой у сярэднім дасягае магутнасці ад 1,35 да 2,5 м.

**Глава 3 “Вытворча-гаспадарчыя заняткі гарадскога насельніцтва”** прысвечана дзейнасці гарадскога насельніцтва Быхава, якое фарміравала яго гарадскую прастору і вызначала побыт гараджан.

**Раздзел 3.1 “Рамесная вытворчасць”** расказвае пра ўвесь спектр прафесійных заняткаў быхаўчан. У Быхаве дакладна існавалі ганчарства, кавальства, гарбарства, шкларобства, збройніцтва, ліцейная і ювелірная справы.

**Падраздзел 3.1.1 “Апрацоўка керамікі і каменю”** прысвечаны масаваму археалагічнаму матэрыялу – кераміцы і каменным вырабам. Керамічныя вырабы падзяляюцца на дзве катэгорыі: побытавую (посуд і керамапластыка) і дэкаратыўна-будаўнічую (кафля, дахоўка, цэгла і інш.). Керамічны посуд прадэманстраваны гаршкамі, макотрамі, міскамі, талеркамі, рынкамі, патэльнямі, збанамі і накрыўкамі.

Выяўлены асобнікі міскападобнай і каробкавай кафлі (карнізная, паясковая і каронкавая). Тэракотавая, зялѐнапаліваная і паліхромная кафля мае двух- і аднапрыступкавыя рамкі. Асноўная арнаментацыя: “краты”, раслінныя, геральдычныя і іншыя сюжэты. Апісаныя артэфакты існавалі ў канцы XVI – XVII ст. Зялѐнапаліваная кафля без рамкі і арнаменту характэрна для комплексаў сярдзіны XVIII ст. Дахоўка маецца “грубая” і шурпатая (як тэракотавая, так і паліваная) XVII–XVIII стст. Комплекс керамапластыкі складаецца з люлек для палення тытуню, дзіцячых цацак, шарыкаў ад мурмельшпілю. Сярод каменных артэфактаў прысутнічаюць тачыльныя камяні і клінкер – абліты зялѐнай палівай будаўнічы камень.

У **падраздзеле 3.1.2 “Апрацоўка шкла”** разглядаюцца шкляныя вырабы з тэрыторыі Быхава і магчымасць іх вырабу гарадскімі майстрамі. Вырабы са шкла падзяляюцца на шкляныя аконныя шыбкі і тарна-сталовы посуд (келіхі, чаркі і шклянкі, шкляніцы, бутэлькі). Артэфакты датуюцца пачаткам XVII – пачаткам XX ст. У пісьмовых крыніцах згадваюцца шкляныя гранаты. Маюцца ўскосныя звесткі аб мясцовым вырабе шкла.

**Падраздзел 3.1.3 “Апрацоўка металаў”** прысвечаны металічным вырабам, знойдзеным на тэрыторыі Быхава, іх паходжанню і згадкам пра іх у пісьмовых крыніцах. З чорнага металу ў Быхаве прысутнічалі: цвікі, падкоўкі на абцас, конскія падковы, акоўкі і дужкі вядзѐр (?), нажы, дзвярныя клямкі/кручкі, былі таксама знойдзены і фрагменты марцірных бомб, ядры, спражкі, сякеры, дзвярныя петлі і завесы, вагавыя гіркі, праколкі/шылы, брытвы, скоблі, акоўкі лапат, красалы, ключы, будаўнічыя кельмы, нажы.

У Быхаве існавала людвісарня, майстры якой працавалі і за межамі горада. З каляровых металаў выраблялі нумізматычны матэрыял, металапластыку і ювелірныя вырабы (культавыя рэчы, гузікі, спражкі, упрыгожванні і інш.), мілітарыі (кулі) і прадукты металаапрацоўкі (кроплі каляровых металаў і аплаўкі свінцу). Кавалі выкарыстоўвалі кувалды, тыглі і льячкі, разнастайныя ювелірныя формы і кіянкі. Інструментарый ювеліраў і кавалѐў: горны, мяхі, малаткі, накавальні, свѐрлы, прабоі, зубілы, клешчы, рашпілі і напільнікі.

**Падраздзел 3.1.4 “Апрацоўка арганічнай сыравіны”** дэманструе асартымент рамесных вырабаў з дрэва, косці, скуры, тканін; таксама расказвае

пра рамеснікаў, якія забяспечвалі гараджан харчаваннем і выконвалі разнастайныя паслугі. Апрацоўка арганічнай сыравіны выступае як жыццёвая неабходнасць, бо ўключае ў сябе забеспячэнне базавых патрэб чалавека.

**Раздзел 3.2 “Гандаль і гандлёвыя сувязі”** паказвае гандлёвыя стасункі горада і яго эканамічнае становішча. Быхаў выступаў як цэнтр латыфундыі – пункт збыту мясцовай сельскагаспадарчай прадукцыі. Артэфакты, якія дэманструюць гандлёвыя сувязі, – грошы (геаграфічна і намінальна разнапланавыя) і гандлёвыя пломбы.

У **раздзеле 3.3 “Сфера паслуг”** разглядаецца дзейнасць гараджан, не звязаная з вытворчымі працэсамі (сістэма медыцынскага, санітарнага і транспартнага забеспячэння, адукацыя і баўленне вольнага часу).

У **раздзеле 3.4 “Адзенне гараджан”** аналізуецца вопратка і абутак з аксесуарамі, якія выкарыстоўваліся жыхарамі Быхава. Вылучаюцца два асноўныя накірункі ў тагачаснай модзе: агальнаеўрапейскі і сарматызм.

**Раздзел 3.5 “Промыслы”** апісвае разнастайныя заняткі, якія з’яўляліся дадатковым сродкам заробку і жыццёвага забеспячэння. Да іх адносяцца рыбная лоўля, паляванне і земляробства.

**Раздзел 3.6 “Выраб зброі і вайсковая справа”** прысвечаны комплексу мілітарый, якім карысталіся быхаўчане, і вайсковай справе гараджан.

**Падраздзел 3.6.1 “Вайсковая справа і ўзбраенне”** дэманструе ролю і месца мілітарызацыі ў жыццядзейнасці насельніцтва Быхава. Узбраенне Быхава XIV – пачатку XVI ст. не выходзіла за межы агульнага комплексу ўзбраення ВКЛ. Збраёвы комплекс быхаўчан канца XVI–XVIII стст. быў вельмі падобным да комплексу мілітарый магілёўскіх мяшчан (артылерыйскі парк, ручная агняпальная зброя, лукі, клінковая, дрэўкавая і абуховая зброя, ахоўнае ўзбраенне). Карысталіся таксама і разнастайным ахоўным узбраеннем і вайсковым рыштункам.

Згодна з **падраздзелам 3.6.2 “Выраб зброі”**, Быхаў з’яўляўся адным з буйных цэнтраў па вырабе зброі і вайсковага рыштунку ў рэгіёне. У XVII–XVIII стст. у Быхаве выраблялі гарматы, марціры, шматствольныя ўстаноўкі – “арганы” і “шмыгаўніцы”. Быхаўская людвісарня рабіла таксама ядры, карцечныя зарады, артылерыйскія і ручныя металічныя гранаты.

**Падраздзел 3.6.3 “Утрыманне вайсковага гарнізона”** апісвае спецыфіку ўтрымання гарадскога гарнізона і падтрыманне яго баяздольнасці. Гарнізоны Быхава падпарадкоўваліся выключна магнатам і забяспечваліся імі ўсім неабходным (зброя, рыштунак, харчаванне і інш.).

Стары Быхаў меў ваенную арганізацыю мяшчан, прынятую ва ўсіх прыватных гарадах ВКЛ таго часу. Кожны мешчанін Быхава быў павінен мець зброю. Базавымі арганізацыйнымі адзінкамі мяшчанскага апалчэння і гарнізона

былі “сотні” і “дзясяткі”, якімі камандавалі “сотнікі” і “дзясятнікі”. Вайсковая служба з’яўлялася павіннасцю для мяшчан прыватнаўласніцкіх гарадоў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

**1.** Гістарыяграфія г. Быхава падзяляецца на тры храналагічныя перыяды, якія адрозніваюцца колькасцю і якасцю навуковых метадаў даследавання.

***Першапачатковы этап даследаванняў:*** XIX – сярэдзіна XX ст. Даследаванні гэтага часу грунтаваліся на працы польскага гісторыка М. Балінскага і з’яўляліся вельмі фрагментарнымі, мелі ў асноўным кампілятыўны характар і зводзіліся да рэферыравання палажэнняў гэтага гісторыка [6; 16; 28].

***Этап урбаністычных даследаванняў:*** другая палова XX ст. Напрыканцы 50-х – пачатку 60-х гг. XX ст. пачынаюць з’яўляцца грунтоўныя працы па беларускай урбаністыцы, звязаныя з навуковымі даследаваннямі З. Ю. Капыскага, А. П. Грыцкевіча, А. Н. Мальцава, Л. С. Абэцэдарскага. Яны закранулі пытанні гандлёва-рameснага, сацыяльна-эканамічнага, палітычнага развіцця рэгіёна. Так, З. Ю. Капыскі і А. П. Грыцкевіч прааналізавалі этапы развіцця горада Быхава на падставе яго сацыяльна-эканамічных паказчыкаў і колькасці насельніцтва. А. П. Грыцкевіч адзначыў, што Быхаў паступова эвалюцыянаваў з сельскага паселішча, якое ляжала побач з умацаваным гаспадарскім дваром, да горада. Вялікую колькасць рамеснікаў і разнастайных спецыялістаў з беларускіх зямель, якія працавалі ў Маскве ў сярэдзіне XVII ст., у тым ліку і з Быхава, апісаў у сваіх працах Л. С. Абэцэдарскі. Ён прывёў даныя па асноўных рамесных спецыяльнасцях Быхава: збройніцтве, “навадному дзелу” (ювелірнай справе), медыцыне. Даследчык вывучаў таксама і эканамічныя стасункі беларускіх гарадоў з Маскоўскай дзяржавай у XVI–XVII стст. (катэгорыі тавараў і кошты на іх). Эпізадычна палітычную і вайсковую гісторыю Быхава, яго ролю ў вайсковых канфліктах XVII ст. разглядаў савецкі гісторык А. М. Мальцаў. Л. Д. Побалем былі праведзены на тэрыторыі горада першыя паўнавартасныя археалагічныя разведкі і раскопкі (ён выказаў меркаванне пра наяўнасць у горадзе ўмацаванняў з напластаваннямі старажытнарускага часу) [6; 16; 28].

***Комплекснае вывучэнне беларускіх гарадоў.*** З 80-х гг. XX ст. з’яўляюцца працы па вывучэнні гарадоў і іх архітэктуры. У даследаванні гэтага кшталту трапіў і Быхаў. М. А. Ткачоў вывучаў развіццё фартыфікацыі г. Быхава і яго

вайсковую арганізацыю ў сукупнасці з мілітарнай гісторыяй у агульнабеларускім кантэксце гістарычных падзей XVI–XVIII стст. І. М. Слюнькова і У. А. Чантурыя правялі значныя даследаванні па вызначэнні эвалюцыі гарадской забудовы, шляхоў яе ўтварэння і ўмоў, якія ўплывалі на яе развіццѐ.

Гандлѐвыя сувязі і грашовы абарот вывучалі Л. С. Абэцэдарскі, А. П. Грыцкевіч, М. А. Ткачоў, В. Н. Рабцэвіч, але толькі са спарадычнымі згадкамі быхаўскіх матэрыялаў ці з дэманстрацыяй Быхава ў комплексе з іншымі гарадамі і ў якасці прыкладу.

Тэматычная спецыялізацыя ў даследаваннях па гісторыі горада Быхава тычыцца работ І. М. Слюньковай, У. А. Чантурыі, К. Касажэцкага, К. Бабятынскага. У гэтых працах гісторыі горада прысвечаны спецыялізаваныя раздзелы. Артыкулы М. А. Волкава, І. І. Сінчука, І. У. Спірына закранаюць пытанні фартыфікацыі, горадаўтварэння і матэрыяльнай культуры Быхава [6; 7; 16].

Гістарычны цэнтр горада археалагічна пачынае вывучацца з 1970-х гг. (Я. Р. Рыер, В. Ф. Капыцін, І. І. Сінчук, І. А. Марзалюк). Я. Р. Рыерам былі выкананы археалагічныя разведачныя работы на тэрыторыі горада, выяўлены паселішчы часоў ранняга жалезнага веку і Сярэднявечча. В. Ф. Капыцін зрабіў поўны звод археалагічных помнікаў на тэрыторыі горада і ахарактарызаваў іх. І. І. Сінчук ажыццявіў першыя комплексныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Быхава, І. А. Марзалюк – першыя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Быхаўскага замка. М. А. Волкаў выканаў аналіз гарадской забудовы на падставе іканаграфічных і пісьмовых крыніц. У канцы XX – пачатку XXI ст. пачалося паўнавартаснае археалагічна-гістарычнае вывучэнне Быхава. Л. Д. Побаль, Я. Р. Рыер і В. Ф. Капыцін праводзілі археалагічныя разведкі. Раскопкі ажыццяўлялі І. І. Сінчук, І. А. Марзалюк, Р. Д. Галынскі. Археалагічныя артэфакты ў асноўным характарызуюць матэрыяльную культуру XVII–XIX стст.; мінімальны комплекс рэчаў XVI ст. і адзінкавыя знаходкі датуюцца XI–XV стст. [1; 2; 6; 13–17; 21; 23; 25; 28].

Паўнавартаснае, комплекснае вывучэнне крыніц па гісторыі горада Быхава і яго насельніцтва ў гістарыяграфіі зроблена ўпершыню.

Калі разгледзець пытанне вывучэння эвалюцыі гарадской прасторы гарадоў і вытворча-гаспадарчай дзейнасці іх насельніцтва ў Беларусі і Заходняй Еўропе, выразна прасочваюцца адрозненні па відах крыніц. На Захадзе – прэвалююць пісьмовыя і выяўленчыя крыніцы, а археалогія і музейныя фонды выконваюць ролю дадаткаў. У Беларусі ж наадварот: недастаткова пісьмовых крыніц, якія могуць выступаць шырокім колам звестак пра вытворча-гаспадарчую дзейнасць насельніцтва беларускіх земляў эпохі Сярэднявечча.

Але з часоў Ранняга Новага часу колькасць пісьмовых і іканаграфічных крыніц значна павялічваецца і на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**2.** У эвалюцыі гарадской прасторы і вытворча-гаспадарчай дзейнасці насельнікаў Быхава, генезісе самога горада як населенага пункта вылучаюцца наступныя этапы:

– сельскае паселішча з феадальным дваром – XIV ст.;

– умацаваная сядзіба-замак – XV ст.;

– паселішча з некалькімі ўмацаванымі сядзібамі-замкамі (да трох) – пачатак XVI ст.;

– прыватнаўласніцкі горад з паўнавартасным замкам, які адначасова з’яўляўся цэнтрам латыфундыі і Быхаўскага графства з драўляна-земляным замкам, – сярэдзіна – канец XVI ст.;

– перапланіроўка гарадской забудовы і ўзвядзенне мураванага замка з гарадской бастыённай фартыфікацыйнай сістэмай – канец XVI ст. –1630-я гг. Горад атрымлівае выразны падзел на кварталы з сакральнымі архітэктурнымі дамінантамі кожнай з канфесій, якія маркіруюць этнаканфесійную і сацыяльную структуру гарадской супольнасці;

– узнаўленне і рэканструкцыя пашкоджаных пасля Паўночнай вайны гарадскіх фартыфікацыйных збудаванняў – сярэдзіна XVIII ст. Рэзкае скарачэнне гарадскога насельніцтва і заняпад сядзібных комплексаў, аднаўленне якіх адбывалася толькі з сярэдзіны XVIII ст. [1; 6–9; 10; 13; 17; 20; 23; 27; 30].

Першая згадка Быхава адносіцца да канца XIV – XV ст., але разам з тым на тэрыторыі горада былі выяўленыя артэфакты XI ст. Наяўнасць на тэрыторыі сучаснага горада селішчаў і грунтовых могільнікаў XI ст. дазваляе датаваць протагарадское паселішча на месцы Быхава старажытнарускім часам [1; 6; 23; 27].

Першую згадку Быхава ўтрымлівае “Спіс Рускіх гарадоў дальніх і бліжніх”, які датуецца У. А. Кучкіным на падставе аналізу маёмаснай прыналежнасці гарадоў, а таксама гістарычных падзей канца XIV – XV ст. не раней за 15 снежня 1448 г. і не пазней за вясну 1449 г. Быхаў у гэтай крыніцы фігуруе як умацаваная сядзіба, “град” [27].

У канцы XV – пачатку XVI ст. адначасова на тэрыторыі горада функцыянавала да трох магнацкіх сядзіб. З другой паловы XVI ст. цэнтрам горада з’яўляўся замак, ад якога радыяльна ў паўночным, паўднёвым і часткова заходнім напрамках разрастаўся горад з новай правільнай планіроўкай. У XVII ст. замак пераўтвараецца ў палаца-замкавы ансамбль, будуецца бастыённая фартыфікацыйная сістэма вакол горада, сінагога, касцёл “латэранскіх канонікаў рэгулярных” з каменнымі келлямі. Тады ж узнікла Лявонаўская слабада, якая разам з паўднёвымі пасадамі была спалена ў

сярэдзіне XVII ст. Другая палова XVIII ст. – час максімальнай разбудовы горада. Перабудоўваюцца фартыфікацыйныя ўмацаванні пасля іх знішчэння ў 1707–1714 гг. расійскімі войскамі. Маѐнтак Белая Гара пачынае ўключацца ў горад, становіцца яго састаўной часткай [1; 6; 10; 13–15; 20; 22; 23; 27].

Паўнавартасным горадам у прававым і сацыяльна-культурным сэнсе Быхаў стаў у 1530-я гг. Далейшаму развіццю горада спрыяла “збіранне” паселішча ў адных прыватных руках (спачатку Хадкевічы, потым Сапегі). З пачатку XVI ст. можна гаварыць пра падзел Быхава на замак і места. Так, і ў Хадкевічаў, і ў Гаштольдаў у пісьмовых крыніцах згадваюцца быхаўскія мяшчане і ў пераліку маѐмасці трапляецца назва “места Быхаў”. З улікам адсутнасці згадак прадмесцяў вынікае, што места мела пэўную сістэму абарончых умацаванняў (паркан, плот, магчыма, вал або роў), у межах яго і пражывала ўсѐ насельніцтва горада [27].

Будаўніцтва паўнавартаснага замка і рэнесанснай гарадской забудовы датуецца 1560-мі гг. і звязана са стварэннем каменнага замка, сфармаванага не раней за 1637 г. Пры Хадкевічах адбылося як мінімум два пераносы замка (пры будаўніцтве драўляна-землянога ў 1560-я і каменнага ў 1600–1637 гг.) і адзін перанос горада (разбудова новага горада з рэнесанснай вулічна-паквартальнай сеткай) [1; 6; 10; 13; 23].

Быхаў будаваўся на аснове праектных планаў, распрацаваных на падставе тэарэтычных і практычных дасягненняў горадабудаўніцтва Рэчы Паспалітай і Еўропы, але з улікам мясцовых асаблівасцяў (рэшткі папярэдняга паселішча і этнасацыяльная структура насельніцтва) [1; 6].

Зыходзячы з малюнка Л. Кууро XVII ст. і планаў горада XVIII ст., можна меркаваць пра наяўнасць шчыльнай сектарнай забудовы горада з правільнай сеткай вуліц і гандлѐвай плошчай і пляцоўкамі перад бастыѐнамі, злучанымі абвадной вуліцай.

У XVII ст. “места” ўмоўна было падзелена на чатыры часткі адпаведна канфесійнай прыналежнасці жыхароў горада: праваслаўныя, каталікі, уніяты і яўрэі. Апошнія, згодна з агульнай практыкай, мяшчанамі не з’яўляліся. На гэта ўскосна ўказвае сектарнае размяшчэнне культавых пабудоў – асноўных архітэктурных дамінант у межах горада. Асноўная гандлѐвая плошча таксама падзяляла горад на дзве часткі: праваслаўныя жылі на поўдні, уніяты – на захадзе, яўрэі – на паўночным захадзе, каталікі і лютэране – на паўночным усходзе [6; 10; 17; 20; 23].

Акрамя замка, на працягу XVII–XVIII стст. у горадзе існавалі архітэктурныя дамінанты – мураваныя і культавыя пабудовы. Да іх адносяцца касцѐльны комплекс (2 каменныя пабудовы), сінагога (каменная), уніяцкая і праваслаўныя цэрквы (у розныя часы драўляныя і драўляна-каменныя).

Сярод грамадзянскіх пабудоў вылучаюцца два каменныя збудаванні, адзначаныя на плане 1781 г. Археалагічна яны датуюцца другой паловай XVII ст. Гэта маглі быць жылыя камяніцы, на што ўказваюць знаходкі паліхромнай і геральдычнай кафлі (адзін з маркераў жылых пабудоў).

Быхаў у XV – пачатку XVI ст. меў сетку пасадаў, якія разыходзіліся радыяльна ад “места”, умацаванага горада. Гістарычныя назвы пасадаў: Лявонаўская слабада, Юр’еўская (Заюр’еўская) слабада, Белая Гара. Назвы гістарычных вуліц і плошчаў: вуліцы Сапежынская, Садовая, Подольная; “Гандлѐвая … плошча” і “Новая гандлѐвая плошча”. Назвы зафіксаваны ў крыніцах канца XVIII–XIX стст. Найстарэйшыя археалагічныя матэрыялы, атрыманыя з тэрыторыі пасадаў, датуюцца канцом XVI – пачаткам XVII ст. [1; 6; 13–15; 20; 23].

У Быхаве на працягу XVI–XVIII стст. было не менш за тры некропалі (Белагорацкія і Сабілаўскія могілкі, а таксама могілкі на Паўднѐвым гарадзішчы) і не менш за тры цвінтары. Дакладна вядома, што ў XVIII ст. яны ўжо існавалі. Белагорацкія і Сабілаўскія могілкі функцыянуюць і зараз [3; 6; 13; 17].

У складзе горада меліся прыватнаўласніцкія юрыдыкі, да якіх таксама адносілі і землі балоння з сенажацямі (не ўваходзілі ў гарадскую забудову). Юрыдыкамі валодалі як мясцовая шляхта, так і рымска-каталіцкі касцѐл [6; 22].

Першапачаткова горад меў толькі вал (магчыма, два) і сухі роў. З XVII ст. – роў з вадой і бастыѐнную сістэму, якая спалучала бастыѐны, равеліны, горнверк і іншыя элементы тагачаснай фартыфікацыйнай сістэмы. Гарадскі вал быў забяспечаны ўязнымі мураванымі брамамі. Усе бастыѐнныя ўмацаванні разам з брамамі былі моцна пашкоджаны, часткова зруйнаваны/узарваны напрыканцы Паўночнай вайны. Яны былі часткова адноўлены к сярэдзіне XVIII ст. [1; 6; 10; 23].

**3.** Горад і замак на працягу свайго існавання змянялі прасторавую лакацыю два разы, што ўносіла свае карэктывы ў побытавую і вытворча-гаспадарчую (у тым ліку і вайсковую) дзейнасць жыхароў горада [7; 8; 9].

Першапачаткова двор князѐў Друцкіх размяшчаўся на тэрыторыі мысавага гарадзішча за 800 м на поўдзень ад сучаснага мураванага замка (XIV – пачатак XVI ст.) [27].

Іеранім Хадкевіч зрабіў перанос замка і горада ў паўночным напрамку (1560-я гг.). Новы драўляна-земляны замак быў закладзены на тэрыторыі сучаснага каменнага ці на тэрыторыі былога касцѐла Непарочнага зачацця Найсвяцейшай панны Марыі, Святога Казіміра і біскупа Аўгусціна. Пры Яне Каралю Хадкевічу і яго спадкаемцах горад быў перапланаваны і закладзены новы мураваны замак (1600–1630-я гг.).

Першыя згадкі Быхава ў летапісах як “горада” і “двара” можна звязаць з Паўднёвым гарадзішчам, якое паступова пераўтварылася ў горад [27].

У сярэдзіне XVI ст. горад быў перанесены на 800 м у паўночным напрамку з поўначы ад прыроднага яра. Туды быў перанесены “першы” замак Хадкевічаў. На пачатку XVII ст. гэта зямля Янам Каралем Хадкевічам перададзена пад будаўніцтва касцёла, а на паўднёвым баку яра разбудаваны мураваны палац. З гэтай прычыны з усходняга боку была размешчана Гандлёвая плошча. Горад у гэты час быў абнесены бастыёнамі (насыпаны часткова з культурнага слоя вакольнага горада другой паловы XVI ст.) [1; 6; 22; 23; 28].

У 1630-х гг. на левым беразе Дняпра была заснавана Лявонаўская слабада.

Знаходкі керамічнага і нумізматычнага матэрыялу дазваляюць гаварыць пра распаўсюджванне пасадаў на значную адлегласць (да 750 м) на поўнач і поўдзень ад замка. Трэба ўлічваць факт існавання ў XVIII ст. фальварка Белая Гара на поўнач ад гарадскіх умацаванняў. Гэта прывяло да значнага выпадання артэфактаў у слой на паўночным ускрайку горада [4–6; 13; 15; 20; 22; 23; 25].

Найбольш старажытныя сярэднявечныя матэрыялы знойдзены на тэрыторыі замка, касцёла і паўночна-ўсходняй часткі гандлёвай плошчы (матэрыялы канца XV–XVI ст.). На Паўднёвым гарадзішчы і замчышчы былі выяўлены матэрыялы III–XI стст. [6; 23; 25].

**4.** Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. была абумоўлена наступнымі фактарамі:

– геаграфічнымі (размяшчэнне на рацэ Днепр – найважнейшым транзітным шляху “з вараг у грэкі”, у эпоху позняга Сярэднявечча ўплывовай гандлёвай артэрыі, якая працягвала выкарыстоўвацца ў працэсе гандлёвай камунікацыі на ўнутраным і знешнім рынку);

– прыродна-кліматычнымі (змены клімату, эпідэміі);

– знешнепалітычнымі (татарская экспансія, далучэнне Падняпроўя да ВКЛ, войны з Маскоўскай дзяржавай);

– сацыяльна-палітычнымі (феадалізацыя, фарміраванне рыцарскага і шляхецкага саслоўя на землях ВКЛ і РП, як вынік – узнікненне магнацкай прыватна-ўласніцкай латыфундыі);

– агульнаеўрапейскімі ўрбаністычнымі тэндэнцыямі эпохі Рэнесансу і барока (ідэальны горад-крэпасць, гарадская забудова, палаца-замкавы ансамбль).

Быхаў узнік з сельскага паселішча і вылучыўся ў цэнтр сельскай акругі. Верагодна, яшчэ ў старажытнарускі час гэта паселішча адыгрывала ролю

гандлѐвай кропкі на дняпроўскім шляху "з вараг у грэкі". Аб гэтым сведчаць курганныя могільнікі ў ваколіцах Быхава. З уваходжаннем Падняпроўя і ўкраінскіх зямель у склад ВКЛ Быхаў апынуўся ў памежным становішчы, выступаючы як пагранічны населены пункт. Ён мог быць перададзены ў якасці леннага, ці беніфіцыяльнага, валодання, што дало падставы для пераўтварэння яго ў абарончую кропку-"двор". З пераходам у валоданне Хадкевічаў Быхаў пачынае інтэнсіўна развівацца і эвалюцыянуе ў паўнавартасны горад з паступовай разбудовай замка/замкаў і гарадской забудовы па апошніх еўрапейскіх інавацыйных тэхналогіях у фартыфікацыі і горадабудаўніцтве [1; 6–9; 24–26].

**5.** Асноўныя функцыі Быхава ў часы Хадкевічаў і Сапегаў – абарончая, рэпрэзентатыўная і эканамічная. Быхаў з'яўляўся цэнтрам адной з найбуйнейшых магнацкіх латыфундый, размешчаных на ўсходнім памежжы РП, адначасова горад быў галоўным збройніцкім цэнтрам у рэгіѐне. З XVII па канец XVIII ст. Быхаў – асноўны мілітарны цэнтр на Падняпроўі. Істотную крыніцу прыбыткаў горада складаў менавіта выраб і экспарт зброі і вайсковага рыштунку.

З улікам максімальнай адаптацыі гарадской забудовы да фартыфікацыйных функцый, наяўнасці першакласнай абарончай сістэмы ўмацаванняў, мясцовага вырабу ўзбраення і пастаяннага кантролю ўладароў за абараназдольнасцю горада, наяўнасці неабходных для абароны горада запасаў зброі, рыштунку, харчавання можна меркаваць аб першапачатковай функцыі Быхава як горада-крэпасці. Другая функцыя – рэпрэзентацыя магутнасці гаспадароў паселішча. Горад размешчаны на высокім левым беразе Дняпра, што з'яўлялася аптымальным месцам для крэпасці, якая не выступала памежным фарпостам. Суднаходны Днепр усѐ ж не забяспечваў тавараабарот, роўны Заходняй Дзвіне ці Нѐману, адкуль тавар ішоў у Балтыку, але быў дастатковым для забеспячэння прыфрантавых рэгіѐнаў у выпадку вайсковага канфлікту. Эканамічны, адміністрацыйны і рэлігійны цэнтр – толькі на трэцяй пазіцыі [1; 4–13; 18–20; 24; 29].

Размяшчэнне горада на Дняпры, наяўнасць замка, людвісарні і кантраляванне сухапутных шляхоў з поўначы на поўдзень уздоўж Дняпра, моцныя фартыфікацыйныя ўмацаванні рабілі Быхаў важным гандлѐва-рамесным цэнтрам беларускага Падняпроўя. Найбольшае значэнне горад набывае з канца XVI ст. (як цэнтр вельмі вялікай магнацкай латыфундыі), пік яго развіцця прыпадае на пачатак XVII ст. З сярэдзіны XVIII ст. горад пачынае занепадаць у сацыяльна-эканамічным плане, нягледзячы на паступовую рэканструкцыю гарадской забудовы [1; 6; 8; 26].

У Быхаве рамесніцкая дзейнасць была дамінуючым заняткам у параўнанні з сельскай гаспадаркай і промысламі. Рамеснікі, якія жылі ў горадзе ў XVI–XVIII стст., працавалі са скурай і мехам, тканінай, займаліся апрацоўкай металаў і вырабам зброі, драўніны, вырабам харчовай прадукцыі, будаўніцтвам і выконвалі транспартныя і іншыя сацыяльныя паслугі (цырульнікі, мяснікі, пекары, бровары і г. д.). Але, у адрозненне ад большасці беларускіх гарадоў таго часу, асноўную ролю ў Быхаве адыгрываў выраб зброі (рамесная спецыялізацыя горада). Астатнія рамеснікі забеспечвалі функцыянаванне мясцовай адміністрацыі, гарнізона, збройнікаў і выкананне экспартных паставак узбраення на рынкі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы [4–6; 8; 11; 12; 18; 19; 22–25; 29].

Дакладна высветлены гарады, з якімі найбольш інтэнсіўна гандляваў Быхаў: Магілёў, Масква, Гародня, Вільня, Каралявец (Кёнігсберг), Кіеў. Выхад на міжнародны гандлёвы рынак Быхава адбыўся ў 1530-я гг. Да экспартных тавараў адносіліся збожжа, зброя, лес. Імпартаваліся жалеза, шляхетныя металы, салетра і сера, прадметы раскошы, тытунь [1; 6].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняльных прац па гісторыі Беларусі, гісторыі архітэктуры, ваеннай гісторыі беларускіх зямель, гісторыі матэрыяльнай культуры сярэднявечных гарадоў, археалогіі беларускіх сярэднявечных гарадоў. Матэрыялы дысертацыйнага даследавання прыдатныя для выкарыстання пры падрыхтоўцы дысцыплін па выбары і дысцыплін кампанента ВНУ ў вышэйшых навучальных установах па гісторыі матэрыяльнай культуры і ваеннай справы. Звесткі па гісторыі і археалогіі Быхава, яго архітэктуры і матэрыяльнай культуры ўвогуле могуць выкарыстоўвацца як краязнаўчы матэрыял для стварэння музейных экспазіцый і падрыхтоўкі экскурсій. Акрамя таго, матэрыялы дысертацыі можна выкарыстоўваць пры афармленні ахоўнай дакументацыі для аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, што размешчаны на тэрыторыі Быхаўскага раёна.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

## Калектыўная манаграфія

1. Шкапляроў, Ю. П. Старабыхаўская крэпасць у XVII ст.: архітэктура і арганізацыя абароны / Ю. П. Шкапляроў, Р. Д. Галынскі // Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манаграфія / Ю. П. Шкапляроў, М. А. Волкаў, Р. Д. Галынскі ; пад навук. рэд. докт. гістар. навук, праф. І. А. Марзалюка. – Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2018. – С. 33–80.

## Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

2. Галынскі, Р. Дз. Археалагічныя разведкі на тэрыторыі г. Быхава Магілёўскай вобласці ў 2012 годзе / Р. Дз. Галынскі // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2018. – № 1. – С. 144–148.

3. Галынскі, Р. Дз. Некропалі Быхава / Р. Дз. Галынскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2018. – № 29. – С. 34–36.

4. Галынскі, Р. Дз. Агульны агляд комплекса артэфактаў з археалагічных даследаванняў на тэрыторыі гістарычнага цэнтра г. Быхава / Р. Дз. Галынскі // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2019. – № 9. – С. 115–122.

5. Галынскі, Р. Дз. Тыповыя рамесныя вырабы з Быхава XVI–XVIII стст. (па дадзеных пісьмовых і археалагічных крыніц) / Р. Дз. Галынскі // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А, Гуманіт. навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2019. – № 2(54). – С. 20–28.

6. Галынскі, Р. Дз. Горад Быхаў у XIV–XVIII стст. (узнікненне, развіццё, эканоміка, вайсковая справа і роля ў рэгіёне) / Р. Дз. Галынскі // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2020. – № 9. – С. 28–36.

7. Галынскі, Р. Д. Агульны агляд побытавай штодзённасці жыхароў Быхава ў XIV–XVIII стст. / Р. Д. Галынскі // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманіт. навукі. – 2022. – № 9. – С. 170–175.

8. Галынскі, Р. Д. Працоўная штодзённасць жыхароў Быхава ў XIV–XVIII стст. / Р. Д. Галынскі // Весн. МДУ імя А. А. Куляшова. Сер. А, Гуманіт. навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2022. – № 2(60). – С. 17–21.

9. Галынскі, Р. Д. Побытавая паўсядзённасць жыхароў Быхава ў XIV–XVIII стст. (па дадзеных археалагічных, пісьмовых, іканаграфічных крыніц) / Р. Д. Галынскі // Беларус. гіст. час. – 2022. – № 9. – С. 61–66.

## Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

10. Галынскі, Р. Дз. Гарадскія ўмацаванні горада-крэпасці Быхаў / Р. Дз. Галынскі // Романовские чтения – 9 : сб. материалов Междунар. науч. конф., Могилев, 29 нояб. 2012 г. / редкол.: Н. М. Пурышева [и др.]. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2013. – С. 83–85.

11. Галынскі, Р. Дз. Агульны агляд комплекса ўзбраення горада Быхава XVI–XVII стст. (па пісьмовых крыніцах) / Р. Дз. Галынскі // Романовские чтения – 10, посвящ. 80-летию со дня основания ист. фак-та : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев 27–28 нояб. 2014 г. / редкол.: И. В. Шардыко [и др.]. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – С. 231–233.

12. Галынскі, Р. Дз. Ахова тулава і канечнасцяў у канцы XVI–XVII стст. На прыкладзе Старога Быхава і Магілёва (па дадзеных археалагічных і пісьмовых крыніц) / Р. Дз. Галынскі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2015. – С. 30–35.

13. Галынскі, Р. Дз. Тапанімія горада Быхава / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – III : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев : ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2015. – С. 21–23.

14. Галынскі, Р. Дз. Эвалюцыя Заюр’еўскай слабады горада Быхава / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – IV : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев : ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2015. – С. 63–65.

15. Галынскі, Р. Дз. Быхаўскі “паўночны” пасад (па дадзеных археалагічных і пісьмовых крыніц) / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – V : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев : ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2016. – С. 24–26.

16. Галынскі, Р. Дз. Гістарыяграфія гісторыка-археалагічнага вывучэння горада Быхава / Р. Дз. Галынскі // Раманаўскія чытанні – XI : зб. арт. Міжнар. навук канф., Магілёў, 26–27 ліст. 2015 / рэдкал.: Я. Р. Рыер [і інш.]. – Магілёў : МДУ імя А. А. Кулешова, 2016. – С. 122–123.

17. Галынскі, Р. Дз. Культавыя пабудовы Старога Быхава ў XVI–XVIII стст. / Р. Дз. Галынскі // Религия и общество – 10 : сб. науч. статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – С. 112–114.

18. Галынскі, Р. Дз. Шабельныя клінкі Магілёва і Быхава з музейных збораў Магілёва / Р. Дз. Галынскі // Магілёўшчына – XIII : зб. навук. артыкулаў

Міжнар. навук. канф. – Магілёў : Могилевский областной краеведческий музей имени Е. Р. Романова, 2016. – С. 188–192.

19. Галынскі, Р. Дз. Вырабы з каляровых металаў з раскопак Быхава ў 2016 г. / Р. Дз. Галынскі // Романовские чтения – 12 : сб. ст. Междунар. науч. конф. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – С. 136.

20. Галынскі, Р. Дз. Выявы горада Быхава на картах і планах XVI–XX стст. / Р. Дз. Галынскі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац X Міжнар. навук. канф., 25–26 мая 2017 г. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2017. – С. 56–62.

21. Галынскі, Р. Дз. Абутковыя падкоўкі з раскопак 2016 года на тэрыторыі г. Быхава / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения –VII : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев : ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2018. – С. 18–19.

22. Галынскі, Р. Дз. Нерухомая маёмасць быхаўскага касцёла XVII–XVIII стст. / Р. Дз. Галынскі // Религия и общество – 12 : сб. науч. статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – С. 158–160.

23. Галынскі, Р. Дз. Стратыграфія горада Быхава / Р. Дз. Галынскі // Романовские чтения – 13 : сб. Междунар. науч. конф. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. – С. 112–113.

24. Галынскі, Р. Дз. Апрацоўка шкла ў горадзе Быхаве XVII–XVIII стагоддзяў / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения –VIII : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев: ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2019. – С. 8–10.

25. Галынскі, Р. Дз. Побытавая кераміка горада Быхава XVII–XVIII стст. / Р. Дз. Галынскі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў XI Міжнар. навук. канф. / уклад.: А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2019. – С. 44–50.

26. Галынскі, Р. Д. Сфера паслуг у Быхаве XIV–XVIII ст. / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – IX : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев: ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2020. – С. 7–10.

27. Галынскі, Р. Д. Да пытання аб узнікненні паселішча Быхаў (канец XIV – пачатак XVI ст.) / Р. Дз. Галынскі // Быховские краеведческие чтения – X : сб. статей региональной науч.-исследоват. конф. – Могилев : ГУК “Быховский районный историко-краеведческий музей”, 2021. – С. 7–12.

28. Галынскі, Р. Д. Гістарыяграфія вывучэння горада Быхава (гісторыя, археалогія) / Р. Дз. Галынскі // Копытинские чтения – 5 : сб. ст. Междунар.

навуч.-практ. конф., Могилев, 23–24 марта 2022 г., г. Могилев / под общ. ред. В. В. Табунова, А. М. Авласовича. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2022. – С. 78–79.

## Тэзісы дакладаў на навуковых канферэнцыях

29. Галынскі, Р. Дз. Агляд комплекса мілітарый г. Быхава па замкавым інвентры XVII ст. / Р. Дз. Галынскі // Молодая наука – 2014 : региональная науч-практ. конф. студентов и аспирантов вузов Могилевской области : материалы конф. / под ред. А. В. Бирюкова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2014. – С. 9–10.

30. Галынскі, Р. Дз. Стары Быхаў на сярэднявечных мапах / Р. Дз. Галынскі // Молодая наука – 2016 : региональная науч-практ. конф. студентов и аспирантов вузов Могилевской области : материалы конференции / под ред. А. В. Бирюкова. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2016. – С. 5–6.

# РЭЗЮМЭ

## Галынскі Раман Дзмітрыевіч

## Эвалюцыя гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст.

**Ключавыя словы**: *Быхаў, двор, горад, гарадская прастора, вытворчасць, гаспадарка, рамесніцтва, Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ), Рэч Паспалітая (РП), горад-крэпасць.*

**Мэта даследавання** – комплексная характарыстыка эвалюцыі гарадской прасторы Быхава, вытворча-гаспадарчай дзейнасці і матэрыяльнай культуры яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. на падставе археалагічных, пісьмовых і іканаграфічных крыніц.

**Метады даследавання**: апісальны, параўнальны, праблемна-храналагічны, параўнальна-гістарычны (кампаратыўны), сістэмны, гісторыка-сістэмны, аналітычны, картаграфічны (планіграфічны), аналогіі, стратыграфічны, тыпалагічны, рэканструкцыі і мадэлявання.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі даследаваны ўвесь спектр крыніц па гісторыі матэрыяльнай культуры беларускага сярэднявечнага горада як маркера эвалюцыі гарадской прасторы Быхава і вытворча-гаспадарчай дзейнасці яго насельніцтва ў XIV–XVIII стст. У навуковы ўжытак уведзены шэраг новых крыніц (археалагічныя калекцыі, фотадакументы, інвентары горада Быхава), якія раней ці не вывучаліся ўвогуле, ці не атрымалі пільнага навуковага даследавання ў кантэксце вывучэння жыцця быхаўчан і матэрыяльнай культуры горада. Створаны каталог археалагічнага матэрыялу, выканана рэканструкцыя знешняга выгляду комплексаў побытавых рэчаў, архітэктурных аб’ектаў і гарадской забудовы.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**. Вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняльных прац па гісторыі Беларусі, ваеннай гісторыі беларускіх зямель, археалогіі беларускіх сярэднявечных гарадоў. Атрыманыя матэрыялы прыдатны для выкарыстання пры падрыхтоўцы дысцыплін кампанента ВНУ па гісторыі матэрыяльнай культуры, археалогіі, гісторыі ваеннай справы. Звесткі пра гісторыю і археалогію Быхава могуць выкарыстоўвацца ў музейнай і турыстычнай справах, ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

**Галіна выкарыстання**: гісторыя Беларусі, археалогія Беларусі, гісторыя ўсходніх славян, археалогія сярэднявечных гарадоў, музеязнаўства.

# РЕЗЮМЕ


## Галынский Роман Дмитриевич

## Эволюция городского пространства Быхова и производственно-хозяйственной деятельности его населения в XIV–XVIII вв.

**Ключевые слова**: *Быхов, двор, город, городское пространство, производство, хозяйство, ремесло, Великое Княжество Литовское (ВКЛ), Речь Посполитая (РП), город-крепость.*

**Цель исследования** – комплексная характеристика эволюции городского пространства Быхова, производственно-хозяйственной деятельности и материальной культуры его населения в XIV–XVIII вв. на основе археологических, письменных и иконографических источников.

**Методы исследования**: описательный, сравнительный, проблемно-хронологический, сравнительно-исторический (компаративистики), системный, историко-системный, аналитический, картографический (планиграфический), аналогии, стратиграфический, типологический, реконструкции и моделирования.

**Полученные результаты и их новизна.** Впервые в белорусской историографии исследован весь спектр источников по истории материальной культуры белорусского средневекового города как маркера эволюции городского пространства Быхова, производственно-хозяйственной деятельности и материальной культуры его населения в XIV–XVIII вв. В научный оборот введен ряд новых источников (археологические коллекции, фотодокументы, инвентари города Быхова), которые ранее либо не изучались вообще, либо не получили должного научного изучения в контексте исследования жизни быховчан и материальной культуры города. Изготовлен каталог археологического материала, выполнена реконструкция внешнего вида комплексов бытовых предметов, архитектурных объектов и городской застройки.

**Рекомендации по практическому применению результатов**. Результаты диссертационного исследования могут быть использованы при подготовке обобщающих работ по истории Беларуси, военной истории белорусских земель, археологии белорусских средневековых городов. Полученные материалы пригодны для использования в подготовке дисциплин вузовского компонента по истории материальной культуры, археологии, истории военного дела. Сведения об истории и археологии Быхова могут применяться в музейном и туристическом деле, охране историко-культурного наследия.

**Область применения**: история Беларуси, археология Беларуси, история восточных славян, археология среднековых городов, музееведение.

## SUMMARY

**Galinsky Roman Dmitrievich**

### Evolution of the urban space of the city of Bykhov and economic-industrial activities of its population in the 14th – 18th cc.

**Keywords**: *Bykhov, yard, city, urban space, industry, economic, craft, the Grand Duchy of Lithuania, Polish-Lithuanian Commonwealth, specialization, fortress city.*

**The purpose of the work** – a research complex characteristics of the Evolution of the urban space of the city of Bykhov and economic-industrial activities and material culture of its population in the 14th – 18th cc., on the basis of archaeological, historical, written and iconographic sources.

**Research methods**: description, comparative, problem-chronological, comparative-historical (comparative), systematic, historical-systematic, analytical, cartographic (planigraphy), analogies, stratigraphic, typological, reconstruction and modeling.

**The results obtained and their novelty**. For the first time in Belarusian historiography a wide range of sources on the history of material culture of the Belarusian medieval city has been comprehensively studied. The author's typology of archaeological complexes was developed, on the basis the evolution of the material culture of the sitythans in the XIV–XVIII centuries is considered. A number of new sources (archaeological collections, photographic documents, inventory of the city of Bykhov) that were not previously studied at all, or were not studied properly in the context of research of the material culture of the city, were introduced into scientific circulation. A catalog of archaeological material and reconstruction of the appearance of complexes of household items, architectural objects and urban development was made.

**Recommendations for practical application of the results**. The results of the dissertation research can be used in the preparation of generalizing works on the history of Belarus, the history of architecture, the military history of Belarusian lands, the history of material culture of medieval cities, and the archeology of Belarusian medieval cities. The obtained materials are suitable for use in the preparation of the university component disciplines in higher education institutions on the history of material culture, archeology, history of military affairs. Information about the history and archeology of Bykhov, can be used in museum and tourism, protection of historical and cultural heritage.

**Field of application**: history of Belarus, archeology of Belarus, history of the Eastern Slavs, archeology of medieval cities, museology.

Падпісана да друку 22.02.2023.
Фармат 60х84/16. Гарнітура Times New Roman.
Ум.-друк. арк. 1,6. Ул.-выд. арк. 1,8. Тыраж 60 экз. Заказ № 45.

Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова”, 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў выдавецкім аддзеле МДУ імя А. А. Куляшова.
212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.